**КА́СНЫ**, ліхія духі, якія дзейнічаюць гуртам. Напаўшы на ахвяру, прысмоктваюцца да яе, нібы п'яўкі, пакуль тая не памрэ. Чым больш ахвяра супраціўляецца, тым з большай сілаю яны прыстаюць да яе, нібы ахопленыя злобай. Адзін з К. не ўяўляе небяспекі для чалавека, аднак тыя, што паблізу, могуць склікаць іншых. Іх піск ахвяра можа пачуць толькі маючы пры сабе абярэг: «чацвярговую соль» — соль, асвечаную ў храме ў Чысты чацвер. Гэтыя нячысцікі маюць агульныя рысы з інш. крывасмокамі: *вупырамі, ератнікамі*. Назва К., магчыма, звязана з бел. дыялектным касны — «сараматны, дрэнны, худы», з рускім дыялектным ка́стный, кастно́й — «паскудны, гідкі, брыдкі, нячысты» (параўнайце таксама Кашчэй, Кашч).

*Літ.*: Никифоровский Н.Я. Нечистики, свод простонародных в Витебской Белоруссии сказаний о нечистой силе. Витебск, 1995.

*У. А. Васілевіч.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ